# Распараджэнне

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

31 мая 2018 г. № 113рп г.Мінск

Аб падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (дадаецца).

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2018 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 1 638 238 рублёў на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ * 2 *
Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
31.05.2018 № 113рп

РАШЭННЕ

савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
па падтрымцы культуры і мастацтва

14 лютага 2018 г. пратакол № 1 г.Мінск

Выдзеліць:

па хадайніцтве Брэсцкага аблвыканкама Івацэвіцкаму райвыканкаму на правядзенне работ па праекце ”Помнік архітэктуры XIX стагоддзя. Касаўскі палацава-паркавы ансамбль. Палац. Пазапляцовачныя інжынерныя сеткі і добраўпарадкаванне“ за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 500 000 рублёў;

па хадайніцтве Гродзенскага аблвыканкама:

Ашмянскаму райвыканкаму на кансервацыю з фрагментарнай рэстаўрацыяй і выкарыстаннем руін былога замка Сапегі з фрагментамі абарончых збудаванняў у аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна:

за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 63 000 рублёў;

за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 187 000 рублёў;

Смаргонскаму райвыканкаму на кансервацыю з рэстаўрацыяй гісторыка-культурнай каштоўнасці ”Фрагменты замка XIV стагоддзя ў в.Крэва, Смаргонскі раён“ за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 888 238 рублёў.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

Н.У.Шарубіна